# ЗАХАВАННЕ ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ – КРОК У БУДУЧЫНЮ. РЭАЛІЗАЦЫЯ КРАЯЗНАЎЧАГА ПРЕКТА «НАШЧАДКІ ТРАДЫЦЫЙ» У ШКОЛЕ

***Рудэнка Людміла Раманаўна,***
*педагог-арганізатар, настаўнік беларускай мовы і літаратуры ДУА «Старобінская сярэдняя школа Салігорскага раёна»*

Найбольш значнымі задачамі выхавання асобы на сучасным этапе з’яўляюцца фарміраванне патрыятызму і грамадзянскасці, заснаваных на любові да сваёй зямлі, народа, мовы, павазе да гісторыі сваёй Айчыны, нацыянальнай культуры, традыцый, звычаяў.

Лічу, што вядучую ролю ў грамадзянска-патрыятычным выхаванні вучняў адыгрывае краязнаўчы матэрыял, бо «толькі вяртанне да сваіх вытокаў праз зварот да гісторыі свайго роду, сваёй маленькай радзімы, яе традыцый і спадчыны здольнае абудзіць пачуццё прыналежнасці да роднай зямлі і ацыянальнай еднасці, выклікаць вялікую стваральную энергію» [1, с.17]. Пазнанне Радзімы можа адбывацца падчас экскурсій гістарычнага і культурнага характару, краязнаўчых вандровак па родным краі, праз выхаваўча-пазнавальныя мерапрыемствы, а таксама праз уключэнне навучэнцаў у даследчыя праекты.

Праект «Нашчадкі традыцый» распрацаваны з мэтай патрыятычнага і ухоўна-маральнага выхавання навучэнцаў праз іх далучэнне да каштоўнасцей беларускай культуры пры вывучэнні і даследаванні рэгіянальных народных традыцый, помнікаў гісторыі і культуры, жыццёвага шляху славутых асоб рэгіёна, моўнай спадчыны і тапанімікі.

Мэта праекта: укараненне ў адукацыйны працэс сучасных форм выхаваўчай дзейнасці; стварэнне ўмоў для актыўнай дзейнасці педагогаў, навучэнцаў, бацькоў, накіраванай на грамадзянска-патрыятычнае выхаванне вучняў сродкамі краязнаўства. Галоўнымі задачамі з’яўляюцца: павышэнне матывацыі да даследчай дзейнасці і развіццё пазнавальнай актыўнасці навучэнцаў; развіццё практычных навыкаў і творчых здольнасцей навучэнцаў сродкамі фальклору, тэатральнай дзейнасці; выхаванне павагі да народнай культуры, пашырэнне ведаў, удасканаленне этнакультурных і даследчых кампетэнцый, майстэрства па выкананні і прэзентацыі творчых праектаў; садзейнічанне сацыялізацыі асобы ва ўмовах сучаснага грамадства з улікам выхаваўчага-адукацыйнага патэнцыялу беларускай народнай спадчыны.

Вядучая ідэя праекта заключаецца ў тым, што навучэнцы, працуючы ў рэжыме супрацоўніцтва з соцыумам, самі ствараюць рознапланавыя краязнаўчыя праекты, у выніку чаго запускаецца працэс самавыхавання, самаразвіцця, самафарміравання грамадзянска-патрыятычных якасцей.

Ажыццяўленне праекта можна арганізаваць праз розныя арганізацыйныя структуры навучэнцаў – паралелі, класы, атрады, групы і г.д. Удзел падлеткаў у ім паспрыяе раскрыццю іх талентаў і магчымасцяў, дапаможа выхаванню духоўнасці, патрыятызму і талерантнасці, падтрымае сацыяльную актыўнасць падлеткаў.

Змест работы на практычным этапе (р*азмеркаванне накірункаў краязнаўчай дзейнасці паміж дзіцячымі структурамі (атрадамі, групамі, класамі).*

Атрадам можна прапанаваць прыдумаць назву самастойна і выбраць накірунак дзейнасці, а можна і загадзя размеркаваць праекты ці міні-праекты. Далей прыведзены прыклады назваў пошукава-даследчых атрадаў і накірункаў іх дзейнасці: атрад «Патрыёт» – «Патрыёты Бацькаўшчыны»; атрад «Вандроўнік» – «Помнікі гісторыі і культуры»; атрад «Летапісец» – «Летапісанне родных мясцін»; атрад «Фальклярыст» – «Моўная спадчына»; атрад «Этнограф» – «Культурныя традыцыі»; атрад «Адраджэнне»– «Славутыя выпускнікі»; атрад «Радавод» – «Гісторыя маёй сям'і ў гісторыі маёй краіны».

Размеркаванне міні-праектаў у дзіцячых структурах (класах, атрадах, групах і г. д.).

Асобная група на ўрачыстым зборы-старце праекта «Нашчадкі традыцый» атрымоўвае канверт з заданнем па пэўнай тэме, якое неабходна выканаць у вызначаны тэрмін. Тэрмін выбіраецца ад аднаго года да трох (яго вызначае школа, лагер, інтэрнат ці іншая дзіцячая структура). Акрамя таго, тут жа даюцца рэкамендацыі па выкананні задання, прапануюцца магчымыя формы творчай абароны. На арганізацыйных зборах навучэнцы вызначаюць шляхі працы над праектам, размяркоўваюць індывідуальныя заданні. Вынікі праекта могуць быць аформлены ў выглядзе відэароліка, прэзентацыі, распрацоўкі мерапрыемства, буклета, альбома, даследчай працы, экскурсіі і т.п.

*Праект «Патрыёты Бацькаўшчыны» (магчымыя міні-праекты для груп):* «Юныя сведкі спаленых вёсак»; «Грамадска-палітычныя дзеячы рэгіёна»; «Партызанскія аб'яднанні і іх героі»; «Падпольная дзейнасць. Малыя героі вялікай вайны».

*Праект «Помнікі гісторыі і культуры» (магчымыя міні-праекты для груп):* «Помнікі ахвярам Вялікай Айчыннай вайны»; «Некропалі рэгіёна, іх гісторыя»; «Помнікі культуры рэгіёна»; «Праекты новых помнікаў для рэгіёна, іх абгрунтаванне».

*Праект «Летапісанне родных мясцін» (магчымыя міні-праекты для груп):* «Гісторыя праваслаўнага прыхода»; «Гісторыя прадпрыемстваў і ўстаноў рэгіёна»; «Тапаніміка і мікратапаніміка рэгіёна»; «Іх імёны носяць нашы вуліцы».

*Праект «Моўная спадчына» (магчымыя міні-праекты для груп):* «Дыялектная лексіка рэгіёна»; «Фальклорная спадчына»; «Антрапонімы (прозвішчы і мянушкі) рэгіёна».

*Праект «Адраджэнне культурных традыцый» (магчымыя міні-праекты для груп):* «Драўляныя карункі: аздабленне хаты»; «Святы і абрады: рэгіянальныя асаблівасці»; «Народныя промыслы».

*Праект «Гісторыя маёй сям'і ў гісторыі маёй краіны»:* сямейныя традыцыі, святыні, дынастыі, рэліквіі. Дадзены праект прапануецца для ўсіх дзіцячых структур.

*Праект «Славутыя выпускнікі»* – міні-праекты могуць быць размеркаваны паміж усімі структурамі па гадах, значымасці ці сферах прафесійнай дзейнасці выпускнікоў.

Этапы работы над праектам: праца з метадычным матэрыялам; супрацоўніцтва з фондамі музеяў і архіваў; сустрэчы са сведкамі; экскурсіі, вандроўкі, паходы; вядзенне дзённікавых запісаў; афармленне праектаў; выніковыя мерапрыемствы; стварэнне відэатэкі; асвятленне вынікаў праектаў у школьнай прэсе і рэгіянальных СМІ.

Прагназуемыя вынікі працы юных краязнаўцаў: арганізацыя этнаграфічных экспедыцый; складанне тапанімічнай карты і слоўніка мясцовай тапанімікі; стварэнне летапісу свайго роду, сям'і, школы, летапісанне родных мясцін; складанне карт, даведнікаў ваенна-гістарычнай і біяграфічнай тэматыкі рэгіёна; правядзенне экскурсій, паходаў і экспедыцый па мясцінах ваеннай гісторыі, выяўленне і добраўпарадкаванне помнікаў вайсковай славы, мемарыяльных мясцін, звязаных з жыццём і дзейнасцю славутых землякоў; правядзенне святочных і тэматычных сустрэч патрыятычнай накіраванасці з удзельнікамі вайны, ветэранамі школы – настаўнікамі, мясцовымі краязнаўцамі, дзеячамі культуры, людзьмі іншых прафесій; афармленне экспазіцыі «Нашы славутыя землякі» ў школьным музеі; вывучэнне традыцый духоўнасці ў фальклоры і нацыянальнай абрадавай культуры; вывучэнне традыцый мясцовага дойлідства; распрацоўка і апісанне турысцка-краязнаўчых маршрутаў з мэтай папулярызацыі маляўнічых краявідаў сваёй мясцовасці, складанне атласаў і каталогаў; напісанне даследчых работ і ўдзел у навукова-практычных канферэнцыях; адраджэнне спрадвечных беларускіх звычаяў, свят, абрадаў; папулярызацыя краязнаўства ў сродках масавай інфармацыі.

Такім чынам, прагназуемыя вынікі навучэнцаў і пералік формаў работы сведчаць, што вывучэнне роднага краю адкрывае шырокія магчымасці для іх дзейнасці – пошуку, даследавання, адкрыццяў.

Сумесная праца з бацькамі, соцыумам у гэтым накірунку будзе развіваць не толькі пазнавальныя кампетэнцыі, актывізаваць вучэбную дзейнасць, а і спрыяць фарміраванню ў падлеткаў актыўнай грамадзянскай пазіцыі і нацыянальнай самасвядомасці.